МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

30 лістапада 2018 г. № 48 (481)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЗАНЯТАСЦЬ

З УЛІКАМ УСІХ ЖЫЦЦЁВЫХ АБСТАВІН



Як будзе дзейнічаць на практыцы Дэкрэт № 3: раскладваем па паліцах

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

УЖО заўтра, 1 снежня, запрацуе база не занятых у эканоміцы грамадзян. А з пачатку наступнага года тыя, хто трапіў у яе, будуць аплачваць асобныя камунальныя паслугі па стапрацэнтным тарыфе. Каго закрануць гэтыя змены і наколькі «пацяжэюць» жыроўкі — падрабязна тлумачым усе новаўвядзенні, звязаныя з Дэкрэтам № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва».

Хто лічыцца занятым у эканоміцы?

Тыя, хто працуе па кантракце ці дагаворы падраду, заняты на дзяржаўных пасадах, знаходзіцца ў вытворчым кааператыве ці фермерскай гаспадарцы. Сюды ж адносяцца прадпрымальнікі і фізічныя асобы, што працуюць без рэгістрацыі ІП і сплачваюць адзіны падатак, рамеснікі, адвакаты, натарыусы. Калі вы аказваеце паслугі ў сферы аграэкатурызму ці з'яўляецеся творчым работнікам (статус пацвярджаецца членствам у творчым саюзе або прафесійным сертыфікатам), то таксама лічыцеся занятымі ў эканоміцы.

У гэту катэгорыю ўключаюць вайскоўцаў, работнікаў ваенізаваных арганізацый, якія маюць спецыяльныя званні, рэзервістаў і ваенна-абавязаных падчас праходжання збораў, грамадзян, якія знаходзяцца на альтэрнатыўнай службе. А таксама служыцеляў царквы, членаў манаскай супольнасці і навучэнцаў духоўных семінарый.

Занятымі з'яўляюцца і грамадзяне, якія маюць ва ўласнасці зямельны ўчастак для вядзення падсобнай гаспадаркі (ці агародніцтва, традыцыйных народных промыслаў, іншых мэт) і вырошчваюць там прадукцыю раслінаводства (акрамя кветак, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады) ці разводзяць жывёл. Але гэта правіла не датычыцца тых, у каго надзел у сталіцы і абласных цэнтрах.

ПРАЦЯГ — на 15-й стар.

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Праекты, асвета, вопыт

Над чым працуюць першыя асацыяцыі мясцовых Саветаў. стар. 4

«Ні прайсці, ні праехаць...»

Чаму ў Мінскім раёне 1700 км «нічыйных» дарог? стар. 14

Навучаць аграбізнесу

У Аршанскім раёне стартуе сацыяльны праект для сельскіх жанчын. стар. 15

Крокі да экалогіі

«МС» працягвае інтэрактыўны праект з чытачамі. стар. 16